# «СМЕХ — ГЭТА СОНЦА»

## Да Дня смеху



**Па гарызанталі: 1.** І воўкі сытыя, і авечкі цэлыя, а пастуху вечная ... (прык.). **5.** ... смех лепшы за першы (прык.). **9.** Юшка без ярша, што ... без бульбы (прык.). **11.** Садовая расліна з аранжава-жоўтымі кветкамі (абл.). **13.** Добрага і карчма не сапсуе, а злога і ... не паправіць (прык.). **15.** Старасць не радасць, горб не ... (прык.). **16.** ... бяды не чыніць (прык.). **18.** Смех смехам, а ... набок (прык.). **19.** Ініцыятыва, пачатак якой-небудзь справы. **20.** Самая доўгая рака ў Францыі. **21.** Не тое смешна, што ... мужа б'е, а тое смешна, што муж плача (прык.). **22.** «Самым шчаслівым смехам смяецца ...». Ж. Батай. **24.** ... прыгожай жанчыны — слёзы кашалька (італ. прык.). **27.** Заплечны рэчавы мяшок. **29.** Такая праўда, як ... сякеру з'еў і дзёгцем запіў (прык.). **31.** Закончаная частка спектакля. **32.** Клей або тлушч, што прымяняецца для прыгатавання фарбаў, лакаў. **33.** Той, хто мала смяецца, а часцей плача.

**Па вертыкалі: 2.** «Пасеяў дзед грэчку, баба кажа: — ...!». З беларускай народнай песні «Пасеяў дзед грэчку». **3.** Прымус, насілле. **4.** Магчыма, яйкі разумнейшыя, чым ..., але яны хутчэй пратухаюць (яўр. прык.). **6.** Люлі, люлі, дзіця, спаць — адна маці, бацькоў ... (прык.). **7.** Шырокая прастора. **8.** Нораў нораву не ... (прык.). **10.** «Хвіга двойчы ўжо схадзіла, // Двойчы ім ... чапіла». З верша Я. Коласа «За дождж». **12.** «Жарт ёсць аслабленне напругі, паколькі ён — ...». Арыстоцель. **14.** Частка тушы, якая прылягае да карка. **17.** «Смех — гэта ...; яно праганяе зіму з чалавечага твару». В. Гюго. **18.** Плод дуба. **21.** «..., як і соль, трэба ўжываць з памяркоўнасцю». Піфагор. **23.** Белы клён. **24.** Лепш ... сябра, чым пацалунак ворага (прык.). **25.** Каб не ..., не адзежка, была б грошай поўна дзежка (прык.). **26.** Калі няма каня, то і ... — быдла (прык.). **28.** Карову б'юць за ..., а бабу — за язык (прык.). **30.** Мужык багаты, што ... рагаты (прык.).

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**Праверце, калі ласка, адказы:**

**Па гарызанталі: 1.** Памяць. **5.** Апошні. **9.** Суп. **11.** Кракос. **13.** Царква. **15.** Карысць. **16.** Запас. **18.** Жарты. **19.** Пачын. **20.** Луара. **21.** Жонка. **22.** Дзіця. **24.** Усмешка. 27. Рукзак. **29.** Сабака. **31.** Акт. **32.** Пакост. **33.** Плакса.

**Па вертыкалі: 2.** Мак. **3.** Ціск. **4.** Куры. **6.** Пяць. **7.** Шыр. **8.** Указ. **10.** Насы. **12.** Адпачынак. **14.** Каркавіна. **17.** Сонца. **18.** Жолуд. **21.** Жарт. **23.** Явар. **24.** Укус. **25.** Ежка. **26.** Асёл. **28.** Зык. **30.** Бык.

Даты | Падзеі | Людзі

### 1 КРАСАВІКА

**1941** год. 75 гадоў таму нарадзіўся Леанід Максімавіч Марчанка, беларускі графік. Працаваў у розных тэхніках станковай графікі, у тым ліку ў акварэлі. Аўтар серый літаграфій «Жанчыны Палесся», «Новабудоўлі Беларусі», а таксама акварэляў «Вясна. Дождж», «Першы снег» і інш.

**1951** год. 65 гадоў таму ў Мінску заснавана выдавецтва «Народная асвета». Выпускае падручнікі, навучальныя дапаможнікі, метадычныя і дыдактычныя выданні для агульнаадукацыйнай школы, навукова-папулярную і даведачную літаратуру, вучэбна-метадычныя комплексы, а таксама навучальную літаратуру для дзяцей з псіхафізічнымі асаблівасцямі развіцця і парушэннямі зроку.



Штогод 1 красавіка ўся планета адзначае Міжнародны дзень птушак (International Bird Day) — інтэрнацыянальнае экалагічнае свята. Яно ўзнікла ў ЗША ў 1894 годзе. Неўзабаве свята, якое атрымала папулярнасць дзякуючы СМІ, пачало масава праводзіцца ва ўсіх штатах, затым прыйшло ў Еўропу, а цяпер праходзіць у рамках біялагічнай праграмы ЮНЕСКА «Чалавек і біясфера» ў многіх краінах свету.

**Было сказана**

**Янка БРЫЛЬ, народны пісьменнік:**

*«Важней за ўсё — правільна думаць і адчуваць, не шкадуючы самога сябе дзеля праўды, бачачы сваё месца ў нашым жыцці, сваю работу, свой абавязак і сваю віну».*

## Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

КОШКА — сімвал даўгалецця. Кошкі заўсёды лічыліся сімвалам даўгалецця. Народная мудрасць сцвярджала, што ў кошкі дзевяць жыццяў. Падставай для гэтага меркавання стала такая яе прыродная якасць, як гнуткасць. Пры падзенні з вялікай вышыні яна падае на лапы.

◈ Згодна са старажытным паданнем, кошкі, незалежна ад афарбоўкі, маглі пазбаўляць ад хвароб, на якія пакутавалі людзі. У народзе добра ведалі, што гладзіць кошку — найлепшы спосаб пазбавіцца ад стомленасці; падчас кантакту з кошкай паніжаецца артэрыяльны ціск.

◈ У народзе верылі ў тое, што «той, хто кошак беражэ, будзе захаваны ад шматлікіх бед», а калі «забіць кошку — сем гадоў поспеху не ведаць». З самага ранняга ўзросту дзяцей, каб яны не сталі злоснымі і капрызнымі, вучылі любіць кошак.

◈ Калі пачыналася навальніца, кошку абавязкова выкідалі за парог, тым самым засцерагаючы хату ад маланкі і пажараў. Паўсюдна існавала перакананне, што ўся нячыстая сіла хаваецца ў катоў, калі Ілья-Грамавяржац «сыпле з неба вогненнымі стрэламі».

◈ Лічылася, што самым лепшым талісманам для маракоў з'яўляецца кошка. Жонкі маракоў трымалі ў хаце чорную кошку, таму што яна павінна была ахоўваць мужа ад няшчасцяў, а на кожным караблі можна было заўсёды знайсці хаця б адну кошку. Прысутнасць гэтай жывёлы засцерагала таксама ад нашэсця пацукоў, якія знішчалі прадукты. Усе акцёры і супрацоўнікі тэатраў трымалі кошак, бо лічылі, што яны прыносяць поспех.

◈ Па паводзінах кошкі прадказвалі стан надвор'я: скруцілася клубком — на мароз; хаваецца ў цёплае месца — да непагадзі і надыходу маразоў; ляжыць на спіне — да цяпла.

◈ Пры ўлазінах у новую хату першай запускалі менавіта кошку — ахвяру. Згодна народным уяўленням, кошка знаходзіцца «пад уладай» дамавіка, таму ён не ўчыніць ёй шкоды.

◈ Часцей за ўсё кошку ставілі ў пару з сабакам. Лічылася, што гэтая пара ўвасабляе сабой маладых: «Кошка і баба ў хаце, мужык і сабака на двары». Можа, менавіта адсюль і ўзнікла ўяўленне пра варожыя адносіны ката і сабакі: «Кошка радуецца смерці гаспадара, а сабака плача; кошка дабаўляе гаспадару пакут у пекле, раздзімае полымя пад катлом, а сабака носіць ваду і гасіць полымя». Пра мужа і жонку, якія жылі ў пастаянных сварках і спрэчках, казалі: «Жывуць, што кошка з сабакам».

◈ Кошка ў славянскіх павер'ях традыцыйна асацыюецца з жаночым пачаткам, таму невыпадковы такі выраз: «Хто кошак любіць, будзе і жонку кахаць».

◈ Самая распаўсюджаная прыкмета: калі кошка мыецца — чакай гасцей. Гаварылі: «Кошка на падаконніку з раніцы гасцей намывае».

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.42 | 19.46 | 13.04 |
| Віцебск — | 6.30 | 19.37 | 13.07 |
| Магілёў — | 6.32 | 19.36 | 13.04 |
| Гомель — | 6.30 | 19.31 | 13.01 |
| Гродна — | 6.57 | 20.01 | 13.04 |
| Брэст — | 6.59 | 20.00 | 13.01 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 31.03—06.04. Месяц у сузор'і Казерога.*

**Імяніны**

***Пр.** Сафіі, Івана, Інакенція.*
***К.** Гражыны, Ірыны.*



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Божухна! Вы вывучаеце хімію?
— Не. Гэта туалетны столік маёй жонкі.

**Не нарадзіся прыгожай, а нарадзіся адна на ўсю вёску!**

У жыцці кожнага бацькі адночы надыходзіць шчаслівы момант, калі тэлефануе дзіця і пытаецца:
— Тата, табе колькі піва браць?

**Вось што вы ведаеце пра аптымізм? Мая суседка, калі мые вокны, заўсёды кладзе ў кішэню ключы ад кватэры. На выпадак, калі вываліцца з акна. А жывем мы на 9 паверсе.**

Праваднiца Наташа, калі ёй надакучвалі пасажыры ў вагоне, падсыпала ім у гарбату снатворнае. А калі ёй ставілася сумна, падмешвала ў гарбату «Віягру».




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.012. Індэкс 63850. Зак. № 1195.
Нумар падпісаны ў 19.30 31 сакавіка 2016 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12